УДК 94 (476) "1861/1862"

# РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ СІТУАЦЫЯ 1861 – 1862 ГАДОЎ У ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ

*С.Я. ГЛАЗЫРЫН*
*(Полацкі дзяржаўны універсітэт)*

*Дадзены артыкул прысвечаны падзеям, якія адбываліся на працягу 1861 – 1862 гадоў на тэрыторыі Віцебскай губерні і папярэднічалі ўзброенаму паўстанню. У савецкай і сучаснай гістарыяграфіі гэты перыяд вядомы як перыяд складвання рэвалюцыйнай сітуацыі. Даецца характарыстыка форм і метадаў барацьбы ў Віцебскай губерні на працягу 1861 – 1862 гадоў; аналізуецца колькасны і сацыяльны склад удзельнікаў рэвалюцыйных выступленняў. Звяртаецца ўвага на рэвалюцыйныя сувязі ўдзельнікаў барацьбы Віцебскай губерні і расійскіх рэвалюцыйных дэмакратаў. Прадстаўляюцца асноўныя праграмныя дакументы цэнтральных і мясцовых органаў кіраўніцтва рэвалюцыйнай барацьбы. Упершыню зроблена спроба сістэмнага аналізу пазначаных падзей на тэрыторыі Віцебскай губерні з прыцягненнем раней невядомых архіўных крыніц.*

**Уводзіны.** Афіцыйным пачаткам паўстання, а дакладней узброеннай барацьбы, лічыцца 10 студзеня (па старым стылі) 1863 года. У гэты дзень у Варшаве былі выпушчаны Маніфест пра паўстанне і аграрныя дэкрэты. Адначасова Цэнтральны Нацыянальны Камітэт у Варшаве абвясціў сябе Часовым Нацыянальным урадам. Ужо 20 студзеня 1863 года Літоўскі правінцыйны камітэт (ЛПК) таксама выпусціў маніфест і абвясціў сябе Часовым правінцыяльным урадам Літвы і Беларусі. У канцы сакавіка – пачатку красавіка 1863 года амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі пачалі дзейнічаць паўстанцкія атрады. Аднак тэарэтычная, ідэалагічная і, нарэшце, матэрыяльная глеба для будучага паўстання на Беларусі і ў Віцебскай губерні ў прыватнасці пачала закладвацца яшчэ напачатку 1860 года. Гэты працэс працягваўся непасрэдна да выбуху ўзброенай барацьбы, у якую арганічна трансфрамаваўся. Такім чынам, перыяд з 1861 па 1862 год можна ахарактарызаваць як перыяд складвання рэвалюцыйнай сітуацыі ў Віцебскай губерні. У рэвалюцыйную дзейнасць на пазначанай тэрыторыі былі ўцягнуты амаль усе слаі тагачаснага насельніцтва, а формы і метады рэвалюцыйнай актыўнасці вызначаліся разнастайнасцю.

**Асноўная частка.** Пераломнай падзеяй у ходзе гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху пачатку 1860-х гадоў у Царстве Польскім і заходніх губернях Расійскай імперыі прынята лічыць сутыкненні польскіх патрыётаў з урадавым войскам у Варшаве 25 – 27 лютага і 27 сакавіка 1861 года [14, с. 289 – 291]. Падчас сутычак было забіта ад 100 да 200 дэманстрантаў, засталіся знявечанымі ды абражанымі каталіцкія святыні. «Выява паламанага крыжа стала з таго моманту для палякаў, літоўцаў і беларусаў-каталікоў сымбалем нанесеных царызмам крыўдаў, сымбалем змагання» [7, с. 385; 14, с. 289 – 291]. У літоўскіх і беларускіх губернях прайшла моцная хваля народнага супраціву жорсткай палітыцы царскага ўрада. Знешне гэта праявілася ў маніфестацыях у падтрымку патрыётаў-палякаў, жалобных шэсцях ды паніхідах па забітых у Варшаве. Агулам за 1861 год у заходніх губернях адбылося блізу 230 выступленняў [115, с. 188].

Цэнтрам руху супраціву ў Віцебскай губерні сталі гарады. За перыяд з канца сакавіка па снежань 1861 года ў іх адбылося 30 акцый незадаволенасці [6, с. 490 – 495; 12, ф. 1430, воп. 1, спр. 31402, арк. 8 – 32; 13, ф. 3046, воп. 1, спр. 1, арк. 1 – 40, 290 – 292], асноўнымі ўдзельнікамі якіх, як сведчаць архіўныя дакументы былі «патрыятычна настроеныя жыхары рыма-каталіцкай веры розных саслоўяў». Найбольш масавыя выступленні назіраліся ў Віцебску (каля 500 чал.), Дынабурзе – 600, Полацку – 400, у астатніх гарадах гэтая лічба не перавышала 100 чалавек. Выразнымі формамі пратэсту на дадзеным этапе з'яўляліся: штотыднёвая жалобная імша ў парафіяльных касцёлах, нашэнне польскага нацыянальнага касцюма часоў Рэчы Паспалітай, якія аздабляліся «рэвалюцыйнымі значкамі» (шыйныя шпількі з аднагаловымі арламі, дамскія каўнерыкі ў выглядзе чорнай тасьмы з выявай белага крыжа, нагрудныя мужчынскія ярлычкі і інш.), спевы патрыятычных песень і польскіх гімнаў, жалобныя шэсці [4, с. 4]. Адметна, што гэтыя выступленні не былі праграмна падмацаванымі (у той час яшчэ не існавала каардынацыйнага цэнтра), а насілі хутчэй стыхійны характар, стаўшы, такім чынам, рэфлексіяй на згаданыя варшаўскія падзеі.

Так, напрыклад, полацкі станавы прыстаў у лістападзе 1861 года даносіў віцебскаму губернатару П.М. Клушыну наступнае: «Сочувствие к польскому мятежу развито в городских костелах в высшей степени… Манифестации в Царстве Польским нашли свое отражение и в городе Полоцке – жители его носят траур, польские национальные костюмы, значки, поют гимны… 16 и 19 октября сего года в Доминиканском костеле состоялась траурная служба, после которой Антон Беликович, Артур и Евгений Рошковские раздавали свечи с черно-белою повязкой, на концах которой изображался одноголовый орел. Затем все пришедшие с зажженными свечами становились на колени и пели гимн "Boze cos Polske"»

[13, ф. 3046, воп. 1, спр. 1, арк. 523]. Як бачна з рапарта віцебскага жандарскага штаб-афіцэра, такая ж сітуацыя назіралася і ў Дынабурзе: «В городе тревожно… молодежь исповедуется и причащается с какою-то особенной торжественностью, как будто в ожидании важных событий… в костеле ксендз Александрович говорил на проповеди, что теперь надобно особенно усугубить молитву за Польшу… Большое стечение жителей в польских костюмах наблюдается на улицах города…» [6, с. 494 – 496]. У арбіту рэвалюцыйнай дзейнасці пазначаных гарадоў разам з Віцебскам траплялі патрыятычна настроеныя жыхары больш дробных павятовых цэнтраў, такіх як Лепель, Гарадок, Сураж, Дрыса, Себеж і іншыя.

Пад канец 1861-га і на пачатку 1862 года нацыянальна-вызваленчы рух у Віцебскай губерні ўзмацняецца і набывае выразную палітычную афарбоўку. Далейшае яго развіцце пераходзіць у скрытую фазу. Разрозненыя дэмакратычныя элементы кансалідуюцца, афармляюцца іх ідэйныя цэнтры. Увосень 1861 года былі ўтвораны Камітэт Руху ў Вільні і Гарадскі рэвалюцыйны камітэт у Варшаве, з гэтага ж часу распачала сваю дзейнасць усерасійская дэмакратычная арганізацыя, якая пазней атрымала назву «Зямля і Воля» [7, с. 401].

Пад уплывам пазначаных арганізацый апынуліся і каталікі розных станаў Віцебскай губерні, згуртаванні якіх афіцыйная ўлада тэндэнцыйна называла «партиями поляков». Але нягледзячы на адзінства мэты – адраджэнне Рэчы Паспалітай – існавалі разыходжанні ў метадах вырашэння гэтай праблемы. Рознымі былі і погляды на тое, хто павінен узначаліць вызваленчую барацьбу. Такім чынам, адбылася палярызацыя рухаючых сіл – ад скрайне левых да рэакцыйна правых, адпаведна ж сучаснай гістарыяграфіі – ад «чырвоных» (левых і правых) да «белых».

Найбольшы ўплыў на ход рэвалюцыйнага працэсу ў Віцебскай губерні аказала мясцовая шляхта. Ізноў, як на пачатку 1861 года, цэнтрамі актыўнасці сталі гарады. На той час большасць служачых мясцовых дзяржаўных устаноў была рыма-каталіцкага веравызнання. Менавіта яны склалі ядро так званай «партии поляков», асноўнай формай дзейнасці якой сталі «таемныя сходы». Вялікую папулярнасць з’езды набылі ў Полацку і Віцебску. Так, увесну 1863 года полацкі судовы следчы паведамляў губернскаму праўленню: «С началом открытых действий в Польше стало заметно приготовление к мятежу и в Полоцком уезде… В самом городе были постоянные собрания поляков – у предводителя дворянства Реутта Эдуарда, ксендза Пиотровского, городничего Лукашевича, судьи Сумароха, аптекаря Бухартовского, капитана Родзевича и в им. Пржесмушках дворянина Милашевича… в городе не совсем чисто: его наполнили поляки, чуждающиеся русского общества; в то время дворяне-католики не посещали заседаний дворянского клуба. Особенно часто собрания поляков проходили в феврале и в мае 1862 г.» [13, ф. 3046, воп. 1, спр. 1, арк. 290 – 311]. Паказальна, што на «таемныя сходы» запрашалі і рускіх афіцэраў, а іх арганізатары «с известной целью» самі наведвалі службоўцаў Полацкага кадэцкага корпуса. Мясцовая адміністрацыя бачыла ў гэтым адзін са сродкаў канспірацыі, а між тым дзякуючы гэтаму яна не здолела выкрыць сапраўдныя намеры. Так, шэраговы полацкай інваліднай каманды на следчай камісіі паказаў: «По воскресеньям у городничего Лукашевича собираются корпусные офицеры Смирновы, Дубасовы, офицеры Мурманского пехотного полка. Сам же Лукашевич часто бывает у преподавателя кадетского корпуса Дубасова, у командира Мурманского пехотного полка полковника Беляева…» [13, ф. 3046, воп. 1, спр. 1, арк. 290 – 311]. У Віцебску месцам «таемных сходаў» былі канспіратыўныя адрасы шляхцічаў Станіслава і Уладзімера Улінскіх, а таксама вядомага беларускага літаратара Арцемія Вярыгі-Дарэўскага. На іх у асноўным збіраліся службоўцы-каталікі мясцовых губернскіх устаноў, навучэнцы старэйшых класаў Віцебскай мужчынскай гімназіі, якія пазней спрычыніліся да дзейнасці віцебскай рэвалюцыйнай арганізацыі [11, ф. 1430, воп. 1, спр. 31302, арк. 30 – 35]. Зараз цяжка адказаць на пытанне: ці былі распрацаваны на гэтых сходах якія-небудзь праграмныя палажэнні, а калі былі то, што яны сабой уяўлялі? Якія мэты ставілі іх удзельнікі? Галоўная прычына – гэта недахоп гістарычных крыніц па дадзенай праблеме, асноўны комплекс якіх складаюць архіўныя матэрыялы ўрадавых устаноў. Інфармацыя, якую яны ўтрымліваюць, часцей за ўсе тэндэнцыйная і аднабаковая. Але нягледзячы на гэта, можна сцвярджаць, што вакол «таемных сходаў» гуртаваліся прадстаўнікі правага крыла вызваленчага руху, так званая «шляхецкая дэмакратыя». Галоўнай рухаючай сілай меўшага адбыцца паўстання яна бачыла найбольш небяспечную для ўрада частку грамадства заходніх губерняў, якую не задавальняла існуючае прававое становішча ў імперыі – былую дробную і сярэднюю шляхту, якая і складала асноўную масу ніжэйшых службоўцаў мясцовых губернскіх устаноў. Таму ёсць падставы лічыць, што першаснай задачай полацкіх і віцебскіх рэвалюцыйных актывістаў было збіранне і кансалідацыя гэтага «небяспечнага» элемента, знешней праявай чаго і сталіся «таемныя сходы». Наступным крокам мясцовых дэмакратаў, які можна лічыць лагічным працягам папярэдняй дзейнасці, было ўсталяванне сувязяў з цэнтральным кіраўніцтвам паўстання для ўзгаднення сумесных намаганняў, выпрацоўкі метадаў вызваленчай барацьбы на тэрыторыі Віцебскай губерні. (Улетку 1862 года Камітэт Руху ў Вільні аформіўся ў сталы кіруючы орган гэтага працэсу на тэрыторыі літоўскіх і беларускіх губерняў і атрымаў назву Літоўскі правінцыйны камітэт) [7, с. 403]. Так, у першай палове студзеня

1863 года ў Полацку з ініцыятывы павятовага маршалка Эдуарда Рэута на чарговым сходзе адбыліся выбары дэлегатаў. Як вынік, Артур Рашкоўскі і Франц Беліковіч (генеральныя дэлегаты) мусілі выехаць у Вільню для атрымання распараджэнняў ЛПК. Траян Гласко, Рыгор Корсак, Канстант Сарасек і Адам Рэут (мясцовыя дэлегаты) павінны застацца на месцы з мэтай пашырэння сувязяў з суседнімі рэвалюцыянерамі [13, ф. 3046, воп. 1, спр. 1, арк. 3 – 5]. Падставай для правядзення выбараў была «Інструкцыя Літоўскага правінцыйнага камітэта для павятовых начальнікаў» ад 28 кастрычніка 1862 года [7, с. 91]. Але была адна акалічнасць – у дадзены момант (студзень 1863 г.) уласна рэвалюцыйнай арганізацыі ў Полацкім павеце яшчэ не існавала. Хаця абранне дэлегатаў у Полацку і адбылося, іх будучая дзейнасць неўзабаве была блакіравана паліцыяй [131, ф. 3046, воп. 1, спр. 1, арк. 3 – 5]. Такім чынам, гэта сталася апошняй спробай мясцовых дэмакратаў без дапамогі звонку актывізаваць вызваленчы рух.

Звесткі пра аналагічныя выбары ў Віцебску і іншых гарадах губерні адсутнічаюць, але вядома, што напрыканцы 1862 года Літоўскі правінцыйны камітэт выслаў сюды сваіх давераных асоб з мэтаю «агітацыі ў асяродку жыхароў рыма-каталіцкага веравызнання» [13, ф. 3046, воп. 1, спр. 1, арк. 1 – 10]. Так, у Віцебск выехалі памешчыкі Уладзімер і Станіслаў Улінскія, Баляслаў Шкленнік, вучань Віцебскай мужчынскай гімназіі Баляслаў Улінскі, у Лепель – Іосіф і Артур Рашкоўскія, у Дрысу – І. Длужнеўскі і іншыя [11, ф. 1430, воп. 1, спр. 31302, арк. 8 – 15; 13, ф. 3046, воп. 1, спр. 1, арк. 1 – 10]. Найбольшага поспеху папулярызацыя рэвалюцыйных ідэй займела паміж выхаванцамі навучальных устаноў Віцебскай губерні – Віцебская і Дынабургская гімназіі, Полацкі кадэцкі корпус. Вынікі гэтай дзейнасці занатаваў у сваей справаздачы папячыцель Віленскай акругі Н.І. Карнілаў: «Занятия хотя и не прерывались, однако во всех гимназиях шли безуспешно – общее внимание, особенно учителей и учащихся польского (тут каталіцкага) происхождения, родные и близкие которых открыто или тайно принимали участие в мятеже, поглощено происходящими в крае событиями. Правильное течение учебной жизни нарушено… ученики своевольничают, производят беспорядки, выгоняют с уроков учителей, особенно преподавателей русского языка…» [10, с. 8 – 10]. Як рэакцыя, 14 лютага 1863 года выйшаў загад віленскага генерал-губернатара Назімава У.І., у якім у прыватнасці гаварылася: «камандзіраваць у кожную гімназію для навядзення парадку 1 штаб-афіцэра і 10 унтэр-афіцэраў з войска, якія мелі прысутнічаць у будынках гімназій з 8.00. да 15.00» [10, с. 8 – 10]. Але гэтая мера не прынесла жаданага плёну. Прыкладам, да пачатку 1863 – 1864 навучальнага года ў Віцебскай мужчынскай гімназіі замест 300 засталося 198 навучэнцаў [10, с. 8 – 10]. У час рэвалюцыйных падзей з навучальных устаноў Паўночна-Заходняга краю выбыла блізу 2 тысяч чалавек [10, с. 8 – 10]. Адны з іх далучыліся да паўстанцаў, другія загінулі, іншыя выключаны за «дурное поведение и сочувствие к мятежу» [10, с. 11 – 13].

Вышэй пазначалася аб існаванні некалькіх ідэйных цэнтраў нацыянальна-вызваленчага руху, якія мелі ўплыў на развіццё падзей у Віцебскай губерні. У гэтых адносінах трэба вылучыць дзейнасць пецярбургскай арганізацыі – Ваеннага таварыства З. Серакоўскага, Я. Дамброўскага (у афіцыйнай гістарыяграфіі – «Центральный польский петербургский кружок») [15, с. 204 – 205]. Яна гуртавала вакол сябе афіцэраў расійскага войска – ураджэнцаў заходніх губерняў імперыі і праграмна была набліжана да «Зямлі і Волі». Асноўным кірункам рэвалюцыйнай актыўнасці арганізацыя вызначыла прапаганду ў асяродку служачых царскага войску, якое дыслакавалася ў гарадах Паўночна-Заходняга краю з мэтай выклікаць «спачуванне да польскай справы» і прадухіліць у выпадку паўстання ўзброены супраціў [15, с. 206 – 207]. З гэтай нагоды па даручэнні З. Серакоўскага ў Вільню выехаў Л. Звяждоўскі. Пад яго кіраўніцтвам у беларускіх і літоўскіх губернях былі ўтвораны мясцовыя аддзяленні Таварыства [3, с. 164 – 170]. Асаблівае значэнне ў Віцебскай губерні члены аддзяленняў адводзілі гарадам: Дынабургу, Дрысе, Рэжыцы, дзе канцэнтраваліся вялікія па колькасці вайсковыя гарнізоны, а таксама Полацку, у якім месціўся Полацкі кадэцкі корпус. Найбольш эфектыўным сродкам прапаганды яны лічылі распаўсюджванне выданняў «Зямлі і Волі» і «Колакала», бо друкаваныя тут «адозвы» ўтрымлівалі асноўныя праграмныя палажэнні арганізацыі. У 1862 годзе мясцовыя ўлады ў часе ліставання з Міністэрствам унутраных спраў паведамлялі: «...с конца 1861 г. среди военнослужащих города Динабурга в большом количестве ходили номера “Великоруса”, в городе Дрисе – “Воззвание к русским офицерам в Польше”, “Российским воинам” и прочие» [15, с. 206 – 207]. Некаторыя рэвалюцыйныя выданні траплялі ў рукі выкладчыкаў і навучэнцаў Полацкага кадэцкага корпуса [13, ф. 3046, воп. 1, спр. 1, арк. 30 – 36]. Якія ж пытанні ўздымаліся ў пералічаных адозвах:

1. Нацыянальнае, альбо праблема самавызначэння Літвы, Беларусі і Украіны.
2. Адносіны Расіі да паўстання.
3. Сялянскае пытанне.

Прыкладам, у лісце «К русским офицерам в Польше» выразна пазначалася: «При теперешнем положении знать, чего желает Литва, Белоруссия, Малороссия, очень трудно; гнет русского правительства не дает ни малейшей возможности высказаться… быть Литве, Белоруссии и Украине с кем они быть хотят,

или не с кем, лишь бы волю их узнать неподдельную и действительную» [5, с. 13; 9, с. 1245 – 1250]. Такім чынам, гаворка ішла пра вольную федэрацыю, або нават незалежнасць гэтых трох зямель, выключна без якога-колечы ўціску звонку. Паказальнай тут з'яўляецца супярэчлівая пазіцыя ўласна паўстанцкага кіраўніцтва (маецца на ўвазе Цэнтральны нацыянальны камітэт у Варшаве) адносна дадзенага пытання. З аднаго боку, ёсць прызнанне права аддзялення: «Мы стремимся к восстановлению Польши в прежних ее границах (межы на 1772 год), оставляя народам, в них обитающим, т.е. литвинам и русинам, полную свободу остаться в союзе с Польшей, или распорядиться собою, согласно их собственной воле» [5, с. 130 – 131]. З другога боку, яно падкрэслівае неабходнасць стварэння унітарнай дзяржавы з трох: «Невозможно требовать от нас признания разделов и отречения от силы, которую придает делу нашей свободы союз трех, в одно целое соединенных народов» (цытуецца паводле ліста ЦНК выдаўцам «Колакала» ад 1 кастрычніка 1862 года, які, дарэчы, з'яўляўся платформай супрацоўніцтва паўстанцаў з рэвалюцыйным рухам Расіі) [5, с. 130 – 131; 9, с. 1205 – 1210]. Што тычыцца праблемы адносін Расіі да паўстання на дадзеным этапе (канец 1862 г.), дык у тым жа лісце «К русским офицерам…» гаворыцца: «Россия к восстанию в данный момент не готова… преждевременный взрыв в Польше ее не освободит, вас погубит и непременно остановит наше русское дело… на Руси, в сию минуту, вряд ли может быть восстание…», але «неудовлетворенный реформой 19 февраля 1861 года крестьянин не поступится, он наверное упрется; восстань тогда, Польша, бросьтесь вы, с вашими и их солдатами в Литву (Беларусь), Малороссию, во имя крестьянского права на землю, – и где найдется сила противодействовать?! – Волга и Днепр откликнется вам, Дон и Урал» [5, с. 132; 9, с. 1245 – 1250]. Сапраўды, апошняе выказванне з'яўляецца ключавым момантам супрацоўніцтва рэвалюцыйнага руху Расіі і Беларусі, і менавіта спроба яго ажыццяўлення была зроблена пазней у Віцебскай губерні, ужо ў часе баявых дзеянняў. Вырашэнне сялянскага пытання ў «Лісце...» пададзена аналагічна паўстанцкай праграме (Маніфест Цэнтральнага нацыянальнага камітэта ад 10 студзеня 1863 г.), гэта значыць надзяленне сялян зямлей адбываецца праз выкуп яе дзяржаўнымі сродкамі, іншымі словамі, праз грашовую кампенсацыю памешчыкам [5, с. 132; 15, с. 95, 330]. Вышэй пазначалася, што сярод служачых Віцебскай губерні распаўсюджвалася і іншая літаратура рэвалюцыйнага кірунку. У прыватнасці, сюды можна аднесці: «Письмо русским офицерам от комитета русских офицеров в Польше», «Русским воинам», «Что нужно делать войску?», «Офицерам всех войск от Общества Земли и Воли». Іх змест мала чым розніцца ад разгледжанай адозвы, а таму паўтарае яе асноўныя праграмныя палажэнні [2, с. 92 – 93; 5, с. 132 – 134]. Такім чынам, дзейнасць Таварыства З. Серакоўскага і Л. Звяждоўскага падкрэслівае народніцкую пазіцыю яго членаў. Сваей актыўнасцю рэвалюцыянеры ўнеслі спецыфіку ў нацыянальна-вызваленчы рух у Віцебскай губерні, дзе ўжо, як гаварылася, спалучыліся інтарэсы пэўных колаў Расіі і Беларусі. Справа была толькі ў тым, наколькі рэальнымі ўяўляліся іх мэты, гледзячы на палітычныя і эканамічныя варункі, якія склаліся на той час у імперыі.

Не меньшы ўплыў на ход рэвалюцыйнага руху ў Віцебскай губерні мела пецярбургская (пазней агульнарасійская) арганізацыя «Зямля і Воля». Яна ўзнікла з ініцыятывы вядомых дэмакратаў Н.П. Агарова і А.І. Герцэна. Дзейнасць сваю «Зямля і Воля» выявіла галоўна ў стварэнні гурткоў, друкаванні і распаўсюджванні адозваў. Справа, за якую арганізацыя была прыцягнута да адказнасці на Віцебшчыне, ёсць так званая Марыенгаўзенская справа. У палове лютага 1863 года ў фальварак, належачы да маентку Марыенгаўзен, што ў Люцынскім павеце, паўстанец Міхал Вэйдэ прывез двух удзельнікаў «Зямлі і Волі» Сцяпанава і Жукава для таго, каб яны маглі друкаваць тут часопіс «Зямля і Воля» [5, с. 132 – 134]. Друкарскія прылады былі размешчаны ў памяшканні ўпраўляючага маенткам Ануфрыя Палонскага, а адказным за іх прызначаны Восіп Сядлоўскі [1, с. 21; 5, с. 119 – 121]. Але па невысветленых дасюль прычынах, друкаванне часопіса прыпынілася (вядома толькі аб 70 паасобніках адозвы ды 1 і 2 нумарах «Свабоды»). Неўзабаве Сцяпанаў і Жукаў выехалі ў Пецярбург, дзе па дарозе былі арыштаваны сялянскай вартай [5, с. 121]. Усяго, да адказнасці па Марыенгаўзенскай справе было прыцягнута 29 чалавек, большая частка з якіх належыла Люцынскай рэвалюцыйнай арганізацыі [5, с. 121]. Следства, такім чынам, выявіла, што адозвы «Зямлі і Волі» былі надта пашыранымі сярод паўстанцаў і чыталіся нават на сходах [9, с. 121]. Пытанне аб маштабах дзейнасці «Зямлі і Волі» на тэрыторыі Віцебскай губерні на сённяшні момант застаецца вельмі спрэчным і неадназначным. Прыкладам, беларускі гісторык Я. Віткоўскі сцвярджае, што яна абмяжоўвалася толькі Марыенгаўзенскай справай, пры гэтым ён лічыць некампетэнтным і неадпавядаючым рэчаіснасці выказванне яшчэ аднаго гісторыка С. Агурскага: «Вот как рассуждали народники, которые работали в 1863 г. в Белоруссии» [1, с. 21; 5, с. 122]. Я. Віткоўскі канкрэтызуе: «Усё ў гэтым сказе з'яўляецца няправільным, пачынаючы з народнікаў і канчаючы на тым, што яны працавалі ў Беларусі. Факт надрукавання адозвы ў Люцынскім павеце, у Латвіі, не можа быць узяты за факт працы на Беларусі» [5, с. 122]. Не задавальняе яго і інфармацыя, якую падаюць у сваей працы М. Шапавалаў і П. Майзель: «У 1863 – 64 гг. у Віцебскай губерні групай, якая складалася ў большасці з рэвалюцыйнай студэнцкай моладзі ды афіцэрства, друкавалася і пашыралася народніцкая часопісь «Зямля і Воля»...

Апрача распаўсюджвання часопісы ды лістовак, яны зрабілі спробу падняць сялянства да паўстаньня... Тады ж у Віцебскай губерні было выдадзена рэвалюцыйным гуртком некалькі нумароў народніцкага часопіса «Свабода» [2, с. 89 – 92; 5, с. 122]. Я. Віткоўскі дае наступны каментар: «Усе ў гэтым выпадку на 100 процэнтаў з'яўляецца няправільным гістарычна і трэба дзівіцца той легкасьці і бездакорнасьці, з якой ствараюцца розныя гістарычныя факты» [5, с. 122 – 123]. Між іншым архіўныя дакументы ўтрымліваюць звесткі аб пашырэнні на тэрыторыі Віцебскай губерні народніцкай літаратуры і яе папулярнасці. Прыкладам, полацкі архіепіскап у 1862 годзе ў лісце да віцебскага губернатара Вяроўкіна падкрэсліваў: «…в городах Витебской губернии "Колокол" наряду с "Великорусом" получил широкое распространение, и благодаря этому мысль о том, что крестьяне угнетены введением "Положений 19 февраля 1861 г.", более чем прежде начинает проникать в народ» [15, с. 203]. Неўзабаве напужаная губернская ўлада загадала земскім спраўнікам (полацкаму, лепельскаму і іншым) здабыць пашыраны ў Віцебскай губерні маніфест «О совершенной свободе крестьян с представлением им всей земли», а таксама адозву Рускага цэнтральнага народнага камітэта (орган «Зямлі і Волі»), якая заклікала сялян паўстаць супраць паноў [5, с. 148 – 150]. След «Зямлі і Волі» быў заўважны і ў Віцебску, дзе яе прыхільнікі-студэнты 28 сакавіка 1862 года ў час маніфестацыі раздавалі часопісы «Колокол» ды «Великорус», а пасля ў цэнтры горада вывесілі сцяг з надпісам: «К оружию, братья! Время уже настало!» [15, с. 206 – 207]. Важнае значэнне ў распаўсюджванні друкаванай прадукцыі «Зямлі і Волі», а разам з тым расійскіх рэвалюцыйна-дэмакратычных ідэй мела дзейнасць будучага арганізатара паўстання ў Віцебскай губерні, вядомага дзеяча беларускай культуры Арцемія Вярыгі-Дарэўскага. Ён на працягу 1861 – 1862 гадоў, па сведчанні чыноўнікаў III Аддзялення, разам з уласнымі беларускімі творамі распаўсюджваў сярод выхаванцаў Віцебскай мужчынскай гімназіі вышэйпералічаныя экзэмпляры [8, с. 236]. Пэўную колькасць народніцкай літаратуры мясцовая ўлада канфіскавала ў 1861 – 1862 гадах ў жыхароў Полацка, як то: «Взгляды революционера или предостережения революционера», «Наставление для обучения в сельских училищах в 8-ми пунктах» і іншыя [13, ф. 3046, воп. 1, спр. 1, арк. 25 – 30]. Такім чынам, бачна, што геаграфія дзейнасці «Зямлі і Волі», альбо яе прыхільнікаў у Віцебскай губерні даволі шырокая. Да таго ж трэба ўлічваць той факт, што ідэі арганізацыі набылі вялікую папулярнасць сярод членаў некаторых паўстанцкіх камітэтаў Віцебшчыны. Гэта ў сваю чаргу наклала спецыфічны адбітак на нацыянальна-вызваленчы рух у Віцебскай губерні. Супрацоўніцтва паўстанцкага кіраўніцтва і расійскіх рэвалюцыянераў цягам 1861 – 1862 гадоў заклала агульны для іх падмурак будучай барацьбы, які вылучала буржуазна-дэмакратычная скіраванасць.

Праграма «Зямлі і Волі» была выкладзена на старонках яе друкаваных выданняў: «Зямля і Воля» і два нумары (1 і 2) «Свабоды», а таксама ў некаторых працах Н. Агарова і А. Герцэна, якія папярэднічалі дзейнасці арганізацыі. Найбольш распаўсюджанымі ў Віцебскай губерні з'яўляліся: «Что нужно народу?», «Что надо делать народу?» і «Слово правды». У работах уздымаліся наступныя праблемы:

1) праблема выбару дзяржаўнага і грамадскага ладу імперыі ды шлях выбару – мірны ці рэвалюцыйны;

2) сялянскае пытанне;

3) вырашэнне нацыянальнага пытання.

Лагічным будзе пачаць з ранніх выданняў, гэта значыць з прац А. Герцэна і Н. Агарова. Так, будучыня Расійскай імперыі ўяўляецца тут як канстытуцыйная манархія на чале з царом і Вялікім земскім саборам – выбарным органам, куды абіраюцца «без различий сословий и веры…» і які рэгулюе падаткі і кантралюе выдаткі [5, с. 128 – 129]. Шлях да ажыццяўлення гэтай мэты мусіць быць рэвалюцыйным: сялянам раіцца, каб яны шукалі сабе прыяцеляў у войску сярод добрых паноў, дапамагаючых грашыма купцоў... [5, с. 128]. Дарэчы, такая ж думка прасочваецца і ў выданнях К. Каліноўскага [7, с. 27 – 39]. Сялянскае пытанне і праграма яго вырашэння сугучныя з праграмай паўстанцкага кіраўніцтва: сяляне надзяляюцца зямлей праз выкуп з агульнадзяржаўных сродкаў – «народ помещиков обижать не хочет. Пусть им казначейство выдает ежегодно в пособие или вознаграждение, сколько нужно примерно хоть 60 миллионов в год из общих государственных податей» [5, с. 127]. Што да нацынальнай праблемы, дык у пазначаных выданнях адчуваюцца прыхільныя і спачувальныя адносіны да прыгнечаных царом нацый: «народ, который кует цепи для других народов сам не в силах выйти из рабства… те солдаты, которые сегодня стреляют по полякам, вчера стреляли и завтра пойдут стрелять по крестьянам, по своим отцам и братьям» [5, с. 129]. Больш падрабязна дадзенае пытанне раскрыта ў адозвах, якія распаўсюджваліся сярод вайскоўцаў. Далейшае развіццё рэвалюцыйная праграма атрымала ў выданнях, звязаных з дзейнасцю «Зямлі і Волі» непасрэдна ў Віцебскай губерні. Прыкладам, ва ўступе часопіса «Зямля і Воля» вызначаецца мэта арганізацыі: 1) злучэнне ўсіх гурткоў, як вайсковых, так і цывільных; 2) усталяванне цесных сувязяў Цэнтральнага народнага камітэта паўстанцаў для сумеснай барацьбы з дэспатызмам і яго паразы. Пры гэтым ажыццяўленне пазначанай мэты мае быць радыкальным – здабытым «цаною крыві», – «напрасно наивные люди надеются возвратить народу похищенные права парламентской борьбой, идущей

теперь почти везде в Европе. Подавленные массы остаются глухими к звонким фразам враждующих парламентских партий, массам нужны хлеб и полная свобода и потому они… питают в себе зародыш грозных восстаний; их натянуто тревожное состояние предвещает близкую гибель существующим порядком…» [5, с. 135 – 136]. Нумары «Свабоды» былі блізкімі па духу выказванняў прыведзенай адозвы.

Такім чынам, дзейнасць «Зямлі і Волі» у Віцебскай губерні, таксама як і папулярнасць выданняў рускіх дэмакратаў (А. Герцэна, Н. Агарова і інш.), стала яскравым прыкладам супрацоўніцтва двух рэвалюцыйных рухаў пачатку 60-х гадоў XIX стагоддзя. Да таго ж іх спарадзіла адна і тая ж з'ява – развіццё капіталізму. Зыходным і яднаючым пунктам супрацоўніцтва было змаганне з расійскім самаўладствам. Сялянскае пытанне, якое імі ўздымалася, патрапіла ў Віцебскай губерні на прыдатную глебу – сяляне тут у вялікай ступені аказаліся незадаволенымі «палажэннямі 19 лютага 1861 года». Але недарэчнасці, якія выявіліся ва ўласнай палітыцы паўстанцаў у час баявых дзеянняў, з аднаго боку, ды рэакцыя царскага ўрада на падзеі 1863 года, з другога, прывялі да адваротнага эфекту (сяляне ў большасці выступілі супраць паўстанцаў). Думкі па нацыянальнай праблеме ў выданнях «Зямлі і Волі» былі даволі дэмакратычнымі і прагрэсіўнымі па тым часе, таму карысталіся папулярнасцю ў паўстанцаў Віцебшчыны. Але ў дадзеным выпадку існавалі значныя цяжкасці ў яе вырашэнні: па-першае, самое самаўладства з'яўлялася вялікай перашкодай; па-другое, нацыянальная свядомасць беларусаў знаходзілася ў зародкавым стане; па-трэцяе, рэвалюцыянеры не давалі канкрэтных парад па правядзенні нацыянальнай палітыкі ў выніку перамогі паўстання, а проста канстатавалі факт існавання гэтай праблемы. З іншага боку, пазіцыя цэнтральнага паўстанцкага кіраўніцтва была больш рэальнай – адраджэнне Рэчы Паспалітай у межах 1772 года, да таго ж традыцыі сумеснага пражывання ў дадзеным дзяржаўным утварэнні заставаліся яшчэ даволі папулярнымі сярод насельніцтва беларускіх і літоўскіх губерняў (асабліва ў асяродку каталіцкай шляхты). Тым не менш дзейнасць «Зямлі і Волі» прадвызначыла спецыфічную ролю Віцебскай губерні ў паўстанні 1863 года.

З канца 1862 года актывізуюцца намаганні цэнтральнага паўстанцкага кіраўніцтва па падрыхтоўцы да ўзброенай барацьбы ў Літве і Беларусі. З мэтай дасягнення большай эфектыўнасці гэтага працэсу ім была праведзена адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа. Так, пазначаная тэрыторыя падзялялася на ваяводствы і паветы. Рэвалюцыйная ўлада ў ваяводстве ажыццяўлялася ваяводскімі камітэтамі, у склад якіх увайшлі: рэвалюцыйны камісар, вайсковы начальнік, цывільны начальнік, начальнік горада ды рэферэнты па розных справах (фінансавых, зямельных, ваенных, транспарантных і інш.). Ваяводскім падпарадкоўваліся павятовыя камітэты, якія мелі аналагічную структуру [16, с. 22 – 23]. Прыкладам, на тэрыторыі Віцебскай губерні былі ўтвораны два ваяводствы: Інфлянцкае і ўласна Віцебскае. Ваяводскім начальнікам у Інфлянты прызначаны Юзаф Понсэт, ваенным – Зыгмунт Буйніцкі [7, с. 321; 16, с. 27]. Хто займаў гэтыя пасады ў Віцебскім ваяводстве пакуль невядома, ёсць звесткі, што ваенным начальнікам тут з'яўляўся Людвіг Звяждоўскі [13, ф. 3046, воп. 1, спр. 1, арк. 67]. Павятовыя паўстанцкія камітэты меркавалася арганізаваць у стратэгічна важных гарадах – Дынабурзе, Люцыне, Віцебску і Полацку. Трэба падкрэсліць, што гэты працэс не быў аднолькавым па часе. Прыкладам, Люцынскі камітэт створаны напрыканцы 1862 года, а Полацкі – у лютым 1863-га. Апошняя акалічнасць, між іншым, стала адным з негатыўных фактараў, які аказаў уплыў на агульны ход паўстання 1863 года ў Віцебскай губерні.

**Заключэнне.** У перыяд 1861 – 1862 гадоў рэвалюцыйны рух у Віцебскай губерні праходзіў некалькі стадый. Спачатку назіраюцца масавыя адкрытыя і стыхійныя выступленні жыхароў рыма-каталіцкага веравызнання ў найбольш буйных гарадах у падтрымку палякаў, пацярпелых ад дзеянняў царскай улады ў Варшаве. З канца 1861 года гэты рух набывае палітычную афарбоўку і становіцца мэтанакіраваным, адначасова пераходзіць у скрытую фазу. Паўсюль у Віцебскай губерні дзейнічаюць члены расійскіх рэвалюцыйных арганізацый (Ваеннае таварыства З. Серакоўскага, «Зямля і Воля»), ствараюцца мясцовыя шляхецкія рэвалюцыйныя згуртаванні, выпрацоўваюцца праграммы дзеянняў. Таму можна казаць, што пазначаны этап у цэлым характарызаваўся цесным супрацоўніцтвам расійскай, польскай і беларускай дэмакратый у справе нацыянальнага вызвалення і аграрнага пытання. Гэта ў сваю чаргу заклала падмурак іх сумесных баявых дзеянняў, што дае права сцвярджаць аб спецыфіке развіцця нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў Віцебскай губерні.

ЛІТАРАТУРА


1. Агурский, С. Революционное движение в Белоруссии (1863 – 1917) / С. Агурский. – Минск: Полымя, 1928. – 237 с.
2. Базилевский, Б. Материалы по истории революционного движения в России в 60-е гг. / Б. Базилевский // Второе приложение к сборникам «Государственные преступления в России». – Париж, 1905. – 260 с.
3. Брянцев, П.Д. Польский мятеж 1863 года / П.Д. Брянцев. – Вильно, 1892. – 517 с.

4. Виленский временник (издаваемый при Муравьёвском музее в г. Вильно). Кн. 6. Архивные материалы Муравьёвского музея, относящиеся к польскому восстанию 1863 г. в пределах Северо-Западного Края. Ч. 1. Переписка по политическим делам гражданского управления с 1 января 1862 по май 1863 г. / сост. А.И. Миловидов. – Вильно, 1913. – 827 с.
5. Віткоўскі, Я. «Зямля і Воля» 60-х гг. і яе сувязь з паўстаннем 1863 году / Я. Віткоўскі // Полымя. – 1930. – № 4. – С. 127 – 136.
6. Восстание 1863 – 1864 гг. в Литве и Белоруссии. Материалы и документы. – М.: Wroclaw, 1965. – 629 с.
7. Каліноўскі, К. За нашу вольнасць. Творы, дакументы / К. Каліноўскі; уклад. Г. Кісялёў. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1999. – 464 с.
8. Кісялёў, Г.В. Ад Чачота да Багушэвіча: Праблемы крыніцазнаўства і атрыбутыкі беларускай літаратуры XIX ст. / Г.В. Кісялёў; навук. рэд. В.А. Чамярыцкі; НАН Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. – Мінск: Бел. навука, 2003. – 426 с.
9. Колокол. Газета А.И. Герцена и Н.П. Огарёва. Вольная русская типография. 1856 – 1867. Выпуск пятый. 1862 год / под ред. М.В. Нечкиной; АН СССР. Ин-т истории. – М.: Изд-во АН СССР, 1962. – С. 981 – 1268.
10. Миловидов, А.И. Участие молодёжи Северо-Западного Края в мятеже 1863 г. и вызванная этим реформа местных учебных заведений / А.И. Миловидов. – Вильно, 1904. – 97 с.
11. Нацыянальны гістарычны архіў у г. Мінску (НГАБ). – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 31302. Справа аб дазнанні асоб з Віцебска за спробу ўзняць паўстанне.
12. Нацыянальны гістарычны архіў у г. Мінску (НГАБ). – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 31402. Справа аб узнагароджанні сялян і ніжэйшых чыноў за дапамогу ў падаўленні мяцежа.
13. Нацыянальны гістарычны архіў у г. Мінску (НГАБ). – Фонд 3046. – Воп. 1. – Спр. 1. Кароткія выпіскі са следчых спраў Віцебскай следчай камісіі за спробу ўзняць паўстанне.
14. Показания и записки Оскара Авейде о польском восстании 1863 года. – М.: Наука, 1961. – 712 с.
15. Смирнов, А.Ф. Революционные связи народов России и Польши 30-х – 60-х гг. 19 в. / А.Ф. Смирнов. – М.: Наука, 1965. – 415 с.
16. Сымон, Б. Сістэма кіравання паўстаннем 1863 – 1864 гг. у Літве і Беларусі / Б. Сымон // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – № 7. – С. 21 – 29.
17. Цылов, Н. Зыгмунд Сераковский и его казнь. С предшествующими её польскими манифестациями в Вильне в 1861 – 1862 гг. / Н. Цылов. – Вильна, 1867. – 60 с.

*Паступіў 11.03.2010*

## REVOLUTIONARY SITUATION OF 1861 – 1862 IN VITEBSK REGION

***S. GLAZYRYN***

*The article is devoted to events that took place in Vitebsk region during 1861 – 1862 and preceded the beginning of insurrection here. The author made an attempt to analyze those events and used some archival sources that were not published early. Reasons for the national and liberation struggle were described. The author analyzed social, political and economical composition of the revolutionary organizations in Vitebsk region. The second issue under research is the problem of tasks and results of the insurrection. The main program documents of the institution of rebel are presented. The problem of the revolutionary contacts between Russian and Belarusian democracy during 1861 – 1862 are solved.*